**Вячэслін, А.** Апошняя вышыня маёра Гайдукова / А. Вячэслін // Зара (Бешанковічы). — 1991. — 13 чэрв. — С. 2.

# АПОШНЯЯ ВЫШЫНЯ МАЁРА ГАЙДУКОВА



Толькі не гэтага пісьма чакалі бацькі. Але яно прыйшло. Вось яго поўны тэкст:

«Паважаныя Лідзія Фёдараўна і Дзмітрый Платонавіч!

З вялікім жалем паведамляем, што, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак у Рэспубліцы Афганістан, Ваш сын, Гайдукоў Дзмітрый Дзмітрыевіч, загінуў 5 верасня 1988 года пры выкананні баявой задачы. Гайдукоў Д. Д. быў адданы справе Камуністычнай партыі, сацыялістычнай Радзіме, цвёрда выконваў патрабаванні воінскай прысягі, праявіўшы ў цяжкіх умовах высокія маральныя і палітычныя якасці, прафесійнае майстэрства. Ваш сын праявіў мужнасць і адвагу, да канца выконваючы пастаўленую задачу.

Камандзіры, палітработнікі, афіцэры, прапаршчыкі, сяржанты і салдаты часці разам з Вамі глыбока смуткуюць з прычыны гібелі вернага сына Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і выказваюць спачуванне Вам, Вашым родным і блізкім з выпадку напаткаўшай Вас цяжкай страты.

Камандзір вайсковай часці падпалкоўнік Сухаплюеў, намеснік камандзіра па палітчастцы падпалкоўнік Славінскі».

Страшэнная вестка імгненна абляцела вёску Дубкі Рубежскага сельсавета, дзе ў 1951 годзе нарадзіўся будучы паветраны сокал. Як жа склаўся яго шлях у неба, у якім столькі небяспекі, нязведанага, нечаканага.

Чатыры класы Дзіма заканчваў у Дубках, сем – у Агрыцкаўцы, дзесяць – у Рубяжы. Адразу пасля школы паехаў у Рыгу, каб звязаць свой лёс з небам, пра што даўно марыў. Не паступіў. Але не такі юнак, каб адступіць перад марай. Дзіма трапляе ў аэраклуб каля вёскі Пяшчанка. Скончыў яго паспяхова і атрымаў накіраванне ў лётнае вучылішча г. Откарска. Адтуль шлях ляжаў на Сахалін. Там працягвалася яго вайсковая служба на вінтакрылых верталётах. Далей быў Калінінград, жонка, кватэра, дзеці.

Перш чым трапіць у пекла Афганістана, Дзмітрый Гайдукоў ужо меў 14 гадоў стажу летнай работы ў Ваенна-Паветраных Сілах СССР і ведаў, адчуваў, што не мінаваць яму Кабула, скалаў, гор, пяшчаных бур гэтай таямнічай пакуль краіны, як і тое, што там працягваецца вайна, сапраўдная,

жорсткая, не на жыццё, а на смерць. Яна, каварная, унесла, падгарнуўшы пад сваё чорнае крыло, жыццё не аднаго аднапалчаніна і сябра. І тым не менш рашыўся. Хаця меў траіх дзяцей. Улічваючы гэга, яго маглі не пасылаць, а пакінуць на месцы, у Калінінградзе. Не згадзіўся. Жонцы Любе сказаў пра гэга не адразу. Не хацеў турбаваць і бацькоў. Нявестка, пасылаючы пісьмы бацькам мужа, рэгулярна перадавала прывітанні ад Дзімы, а той ужо ваяваў у Афганістане, куды прыбыў 1 верасня 1987 года.

Бралі толькі на год. Але ж у ім цэлых 365 дзён і кожны для яго мог аказацца апошнім. Але пакуль вязло, толькі ў жывот параніла. Нарэшце Люба не вытрымала і напісала бацькам праўду.

Першае пісьмо ад сына прыйшло з Кундуза. Пісаў 10 верасня 1987 года:

«Добры дзень, мае дарагія бацькі. Прыслала мне Любаша тваё, мама. пісьмо. І вось я пішу вам. Не хацеў нікога засмучаць гэтым Афганістанам, але раз жонка ўжо паведаміла, то што зробіш. Цяпер вы ўсё ведаеце. Але турбавацца зусім не трэба. У гэты час тут не ваююць – мір. Так што за мяне не хвалюйцеся. Прыйдзе лета, і мы зноў сустрэнемся. Галоўнае, мама, беражыце сябе...»

У пачатку сакавіка 1988 года Дзмітрый прыляцеў у Саюз на чарговае абследаванне. Міжнародны жаночы дзень сустракаў у кругу сям'і, бацькоў.

– 13 сакавіка, – усламінае маці, – сын і нявестка праводзілі нас, і больш я яго не бачыла. Праўда, у чэрвені ён знаходзіўся ў чарговым водпуску ў станіцы Тамань Краснадарскага краю, дзе жылі бацькі жонкі. На гэты раз нас там не было. На жаль. Вось калі б ведаць...

Яшчэ адна вытрымка з пісьма Дзмітрыя. Адпраўлена яно 28 ліпеня 1988 года:

«Добры дзень, мае дарагія бацька і маці. Паведамляю: я жывы і здаровы. Усёй эскадрылляй прыляцелі на новае месца і цяпер будзем жыць у населеным пункце Пулі-Хумры. Наш аэрадром поўнасцю аддаюць дэмакратам. Колькі яшчэ прыйдзецца тут служыць – невядома, але спадзяёмся, што ў кастрычніку-лістападзе заменяць...»

Яго і сапраўды замянілі, калі б...

5 верасня экіпаж вялізнага ваеннага верталёта, камандзірам якога быў Дзмітрый Гайдукоў, узняўся ў паветра. У вызначаны пункт трэба было даставіць салдат. Да цэлі ўжо блізка. Раптам у верталёт трапіла цеплавая ракета душманаў... Тры члены экіпажа, усе салдаты загінулі.

10 верасня дзве драўляныя труны даставілі ў Калінінград, устанавілі ў гарадскім Доме афіцэраў: Д. Д. Гайдукова і яго сябра У. Брусняцова. Быў жалобны мітынг і на аэрадроме, дзе служылі гэтыя лётчыкі да Афганістана. Афіцэры спрабавалі гаварыць, але з-за слёз не змаглі. Нарэшце труны пагрузілі ў ваенны самалёт, які ўзяў кірунак на Курск, адкуль быў родам таварыш Дзмітрыя Гайдукова. Адтуль цераз Анапу – у Тамань.

Там пахаваны ваенны лётчык першага класа наш зямляк Дзмітрый Дзмітрыевіч Гайдукоў. Над магілай узвышаецца чорны мармуровы помнік з партрэтам. У раённым цэнтры Цямрук таксама ёсць помнік землякам-афганцам. Апошнім, шостым у гэтым спісе значыцца і прозвішча Д. Д. Гайдукова.

Любоў Мікалаеўна Гайдукова цяпер жыве ў Мінску. Нядаўна атрымала трохпакаёвую кватэру. Расціць трох сыноў. Старэйшы Вова ходзіць у дзевяты, сярэдні Дзіма – у сёмы, а малодшанькі Вадзік яшчэ толькі ў другі клас. Яны, відаць, таксама мараць пра высокае неба, але толькі мірнае і спакойнае, а не такое, якое выпала на горкую долю іх дарагога бацькі.

Наблізіўся да фінішу сумны расказ. Гэта мая асабістая даніна павагі і памяці чалавеку, які ў росквіце сіл (ў 37 гадоў) за нішто склаў сваю галаву. І было б у вышэйшай ступені справядліва, каб

наш пассавет таксама нешта зрабіў для ўшанавання яго светлага імя. У прыватнасці, назваў бы адну з новых вуліц райцэнтра імем Д. Д. Гайдукова. Тады б не сорамна было глядзець у вочы яго бацькам, жонцы, дзецям, брату, нарэшце, самім сабе.

Зрабіць гэта не цяжка. Важна захацець. Чалавек заслужыў гэтага. Вось яго ўзнагароды: ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За самаадданую службу» III ступені, спецыяльны знак «За самаадданую ратную працу ў Чырванасцяжнай Туркестанскай ваеннай акрузе» і два медалі «Воіну-інтэрнацыяналісту» ад удзячнага афганскага народа, уручаныя асабіста прэзідэнтам Рэспублікі Афганістан.

**А. Вячэслін**